Источник: "Голас Радзімы" - 2014-06-12

# Знаёмцеся: Скідзель

## Кнігу пра горад на Гродзеншчыне напісалі гісторык і краязнавец

Выданне "Скідзель і яго ваколіцы: жывая гісторыя" прэзентавалася ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Я. Коласа НАН Беларусі, яго аўтары — гісторык Сяргей Токць і краязнавец Мікалай Дзелянкоўскі. Кніга будзе цікавай для многіх, бо напісана з выкарыстаннем як архіўных крыніц, так і вусных успамінаў ды краязнаўчых матэрыялаў. Гэта погляд на гісторыю Скідзеля ад XV стагоддзя да сярэдзіны стагоддзя мінулага.

Кніга насычаная імёнамі самых звычайных, "не засвечаных" раней людзей, у ёй шмат жыццёвых гісторый. Раздзелы ж у першай частцы выдання, можна сказаць, эпахальныя: "Эпоха Вялікага Княства і Рэчы Паспалітай", "У Расійскай імперыі", "У міжваеннай польскай дзяржаве". Ёсць і лірычны раздзел "Край змагароў, край паэтаў", і "дзелавы": "Лёс прадпрымальнікаў Скідзельскіх".

"Голас радзімы". Знаёмцеся: Скідзель